# Асоба

2 сакавіка на 69-м годзе пайшоў з жыцця рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, вядомы вучоны ў галіне радыёфізікі **КУХАРЧЫК Пётр Дзмітрыевіч.**



Пётр Дзмітрыевіч нарадзіўся 22 сакавіка 1945 г. у в. Орда Клецкага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы вучыўся ў Мінскім электратэхнікуме сувязі, служыў у Савецкай Арміі. У 1972 г. скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Радыёфізіка і электроніка». Працаваў навуковым супрацоўнікам, загадчыкам лабараторыі Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем БДУ, загадчыкам кафедры радыёфізікі, прарэктарам па вучэбнай рабоце і першым прарэктарам БДУ, намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэктарам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У 1977 г. абараніў дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук, а ў 1988 г. у Маскоўскім інстытуце радыётэхнікі і электронікі – дысертацыю на саісканне вучонай ступені доктара тэхнічных навук. З 1990 г. – прафесар. У 1994 г. абраны членам-карэспандэнтам НАН Беларусі. Аўтар звыш 160 навуковых прац. З’яўляўся старшынёй Міжнароднага саюза вучоных у галіне радыёнавук. З сакавіка 2003 г. працаваў рэктарам Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка.

Рэктарат БДПУ імя М. Танка, грамадскія арганізацыі выказваюць спачуванне родным і блізкім П. Д. Кухарчыка, яго калегам, вучням, усім тым, хто ведаў гэтага светлага чалавека.

19 марта 2014 года на 60-м году жизни скоропостижно скончался заведующий кафедрой дипломатической и консульской службы факультета международных отношений БГУ, ответственный секретарь журнала «Вышэйшая школа», кандидат исторических наук, доцент **МИХАЛЬКЕВИЧ Георгий Николаевич.**



Георгий Николаевич родился 30 июля 1954 г. в г. п. Березовка Гродненской области. В 1976 г. он окончил Минский педагогический институт имени М. Горького. Прошел путь от учителя географии и биологии до директора школы. После окончания Минской высшей политической школы занимался преподавательской работой. В 1989 г. был направлен на учебу в аспирантуру Высшей политической школы (Прага). В 1991 г. окончил аспирантуру Российской академии управления (Москва), где защитил диссертацию на соискание ученой степени кандидата исторических наук. Работал заместителем генерального директора Фонда международного молодежного сотрудничества Республики Беларусь. С 1996 г. являлся доцентом кафедры дипломатической и консульской службы. Сферой его научных интересов были практика дипломатической и консульской службы, культурная дипломатия, протокол и этикет международного общения. Георгий Николаевич стоял у истоков создания и долгие годы являлся бессменным ответственным секретарем журнала «Вышэйшая школа», его координатором и идейным вдохновителем.

Г. Н. Михалькевича отличала жизненная рассудительность, дипломатическая корректность, компетентность, острый ум, внимательность к коллегам, личное обаяние.

Светлая память о Георгии Николаевиче Михалькевиче останется в сердцах тех, кому посчастливилось работать вместе с ним. Редакция журнала «Вышэйшая школа» выражает глубокие соболезнования родным и близким.